Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem

Цана асобнага нумару 20 грошаў.

НАШ ГОЛАС

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 6 — Вільня, Субота 12-га лютага 1927 г. — Год I

На фоне апошніх падзеяў.

Сялянска-работніцкая прэса ў апошнія часы аказалася гэтак прыдушанай, што блізу зусім перастала дахадзіць да вёскі. За тое адначасна вёска закідаецца буржуазнымі выданьнямі, якія могуць шмат каго чыста абаламуціць.

Запраўды-ж: польскія ўрадавыя ўстановы ганьбуюць пакінуўшых іх людзей як-быццам не за тое, што вырακліся супрацоўніцтва з імі, а—іменна за *факт гэнага супрацоўніцтва*! Мала таго: колішнім сваім супрацоўнікам, якія працай сваей стараліся пакіраваць урадавую палітыку ў непажаданым для *сягоньняшняга* ўрадавага курсу кірунку, прыпісываюцца няслушна „заслугі" такога характару, што яны могуць проста забіць маральна чалавека! І ў гэтай акцыі прымаюць учасьце ня толькі блізкія да ўраду партыі, але ўся агулам польская буржуазія, дый іншыя „меншасьцёвыя" групы—з „нашымі" сельсаюзьнікамі і хадэкамі на чале!

Адначасна адбываецца паход проці Грамады. Слухаючы соймавыя прамовы беларускіх паслоў з варожых Грамадзе партыяў, можа здацца, што яны запраўды-ж шчыра бароняць сваіх заарыштаваных калегаў-грамадаўцаў. Але пачытайце хадэцкую і сельсаюзьніцкую прэсу, і вы ўбачыце, што—адначасна з такімі на-пагляд пекнымі прамовамі ў Сойме—і „Беларуская Крыніца" і „Сялянская Ніва" ня спыняюць сваей зьвягі на Грамаду, паўтараючы закіды проці яе, як проці „камуністаў", ды гэтак *апраўдываючы пастукі ўраду*, проці каторых паслы Ярэміч і Рагуля так, здаецца, „шчыра" пратэставалі з соймавае трыбуны!

Як-жа пагадзіць такія дзіўныя зьявішчы, як салідарны паход *„нашых"* сельсаюзьнікаў і хадэкаў—поплеч з *польскімі* буржуазнымі партыямі—проці грамадаўскіх і блізкіх да іх дзеячоў, а так сама проці пасла Воевудзкага? Чым растлумачыць факт, што павадыры хадэкаў і сельсаюзьнікаў у прыватных гутарках стараюцца нягодна ачарняць найвыдатнейшых дзеячоў радыкальнага кірунку, займаючых кіраўнічыя становішчы ў беларускім адраджэнскім руху наагул?!

Сучасны мамэнт тым і цікаўны, што ён выявіў тую глыбокую *ідэолёгічную розьніцу*, якая істнуе паміж беларускім сялянска-работніцкім рухам і яго ідэолёгамі—з аднаго боку, ды хадэцка-сельсаюзьніцкім кірункам—з другога. Хадэкі і сельсаюзьнікі настолькі розьняцца ад грамадаўскага руху *сацыяльна*, што—ня гледзячы на супольнасьць нацыянальных ідэалаў — пачуваюць сябе *бліжэйшымі навет да польскае буржуазіі*, чым да грамадаўцаў. І затым-та хадэкі і сельсаюзьнікі стаюцца натуральнымі саюзьнікамі польскае буржуазіі, калі тая змагаецца з польскім ці з беларускім *сацыяльным радыкалізмам* — з „энпэхамі" („Незалежна Партыя Хлопска") і з Грамадой. Паскольку-ж паны Рагулі і Ярэмічы выступаюць у Сойме, баронячы заарыштаваных паслоў ад выдачы іх суду, дык тут справа йдзе аб узаканеньне ці неўзаканеньне ўжытае ўрадам сыстэмы барацьбы з нямілымі яму партыямі, бо-ж тое, што сталася сяньня з грамадаўцамі, як *сацыяльнымі радыкаламі*, можа стацца з другімі групамі, як *радыкаламі нацыянальнымі*.

Вось разгадка недаўменнага на першы пагляд пытаньня: чаму хадэкі і сельсаюзьнікі, якія йшчэ так нядаўна нападалі на паслоў Тарашкевіча і інш. за „разьбіцьце адзінага нацыянальнага фронту", бачучы ў гэтым найвялікшы грэх,—цяпер, у мамэнт разгрому польскай буржуазіяй наймагутнейшае—стотысячнае—масавае беларускае арганізацыі, распачалі асабліва энэргічны паход проці дзеячоў і павадыроў гэнае арганізацыі, не перабіраючы ні ў якіх спосабах ганьбаваньня ведамых барацьбітаў за волю і правы беларускага народу. „Адзінства нацыянальнага фронту" аказалася *фікцыяй* у найбольш цяжкую для беларускага руху часіну: яго разьбілі розьніцы *сацыяльнага* характару, абярнуўшы ўчорашніх прыяцеляў—ў ворагаў, а ўчорашніх ворагаў—у саюзьнікаў.

Беларускі нацыяналізм, узгадаваны на груньце буржуазнага сьветапагляду, стараецца разьбіць найвялікшую частку *беларускага нацыянальнага актыву*, які, натуральна, ня можа зьмясьціцца ў вузкіх рамках буржуазнае ідэолёгіі. Беларускі нацыяналізм хоча зьнішчыць акурат тыя беларускія актыўныя сілы, якія ўсьцяж тварылі і твораць нацыянальнае культурнае багацьце. І ў гэтым — *ягонае банкруцтва*!

Але ніякая сіла, ніякія фізычныя ці маральныя ўдары ня здольны разьбіць беларускага сялянска-работніцкага актыву: зьнішчыць яго можна толькі адначасна з фізычным зьніштажэньнем нацыі.

Водгукі „Косаўскае страляніны"

У „Robotniku" зьмешчана карэспандэнцыя, якую падаем цалком:

„Косаў, які стаўся 3/II. мейсцам крывавых падзей, ёсьць „уласнасьцяй" старосты Янішэвскага. Мы некалькі разоў перасьцерагалі ў „Robotniku" перад мэтадамі ўрадаваньня гэтага пана. Мы адзначалі дзіўнае пастуланьне п. Старосты пры ліквідацыі дывэрсыйных бандаў, калі паліцэйскія агенты ня толькі насьледавалі" (падшываліся пад) бандытаў, але—рабілі бандыцкія напады. Мы выяўлялі тады і асаблівыя спосабы „знаходжаньня" ў „западаароных" асоб розных адозваў і транспарантаў,—ня толькі **такіх самых**, але і — **тых самых**, якія перад тым знаходзіліся ў камандзе паліцыі. Мы пісалі аб біцьці селяніна па твару за тое, што ён з возам дроў не адразу зьехаў у бок перад брычкай п. Старосты. Усе гэтыя мэтады цяпер далі рэзультаты".

„Паліцыя павінна была ведаць і ведала-ж аб падрыхтаваньнях да дэманстрацыі. Трудна дапусьціць, што яна не магла не дапусьціць паходу. Але трудна думаць, каб „жонд" п. Янішэвскага, пад якім сотні людзей гадамі трымаюць у вастрозе, а пасьля суд, не знаходзячы віны, зваляьняе іх ад кары, — клапаціўся аб недапушчэньні, а не аб—„усьмірэньні".

„Głos Prawdy" аблічае дэманстрантаў на 1500 чалавек, ды цешыцца з таго, што (быццам) у „ўсьмірэньні" прымалі ўчасьце стральцы. З гэтае прычыны „Robotnik" перасьцерагае, што між беларускім сялянствам і польскімі асаднікамі выкапана неперахадная прорва.

ВЯЛЕЙСКАЯ АКРУЖНАЯ УПРАВА гэтым просіць гурткі Т-ва Беларускае Школы, а таксама і сяброў Т-ва аб прысылцы 50% адлічкі ад сяброўскіх складак.

Каб ня было перабояў у працы павятовай культурнай Установы, якая кіруець усей працай у павеце, — усе сябры Т-ва павінны выпаўніць свой сяброўскі абавязак і ўнясьці складку.

Акружная Управа таксама прызываець сяброў да культурна асьветнай працы ў усіх яе галінах. Закладайце гурткі Т-ва, закладайце Народныя Дамы і бібліятэкі чытальні, ды прыватныя беларускія школы, у якіх будуць узгадовывацца будучыя барацьбіты за лепшую будучыню.

Вялейская Акружная Управа
Т-ва Белар. Школы.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Гістарычны дзень у Сойме.

(*Справа выдачы беларускіх паслоў*).

Як мы ўжо падавалі, у пятніцу 4 лютага ў Сойме нарэшце адбыліся дыскусія і галасаваньне ў справе арыштаваных паслоў-беларусаў.

Дакладчык, пас. **Добжаньскі**, эндэк, як і трэба было спадзявацца, зусім бяскрытычна аднёсься да матэр'ялаў, прадстаўленых пракуратурай, якая з свайго боку цалком палажылася на дадзеных дэфэнзывы і палітычнай паліцыі.

Дакладчык паўтарае, што паслоў Беларускай Грамады вінаваціць у тым, што быццам яны стаялі на чале... Польскай Камуністычнай Партыі і Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі; што „з даручэньня гэтых партыяў стварылі падпольную групу, якая кіравала дзеяльнасьцю яўных, адкрыта і легальна працаваўшых партыяў — Бел. Сял.-Раб. Грамады і Незал. Сялянскай Партыяй. Мэтай усіх гэтых партыяў было—падрыхтаваньне—з даручэньня „суседняй дзяржавы"—аружнага паўстаньня дзеля збурэньня істнуючага дзяржаўнага ладу ў Польшчы і адарваньня Беларускіх Зямель ад Польшчы. На выпадак вайны кіраўнікі Грамады абязаліся памагчы дывэрсыйнай акцыяй на тылох польскіх войскаў"... Дзеля ўсяго гэтага абвінавачаныя паслы Бел. Грамады тварылі ў краі „камуністычныя ячэйкі і камуністычна баявыя ячэйкі ў войску — пад кіраўніцтвам агентаў суседняй дзяржавы, атрымліваючы на гэта ад апошняй вялікія грошы". „Істнуюць так сама паважныя ўлікі, што ў лоне гэтых арганізацыяў займаліся ваенным шпіёнствам—на карысьць суседняй дзяржавы"...

П. Тарашкевічу закідаецца, што прымаў бясспыннае ўчасьце ў змове і быў яе кіраўніком. Ён злажыў праект цыркуляра... Цэнтральн. Камітэту Польскай Камуністычнай Партыі, які дае плян усей камуністычнай акцыі. Ён прымаў учасьце ў канфэрэнцыі ў Гданску, дзе атрымаў 15 тыс. даляраў на гэтую акцыю. Ён вёў выразна гэтую бунтаўнічую і здрадніцкую работу. Грошы на гэта пасьля ішлі праз Беларускі Каапэратыўны Банк у Вільні, якога п. Тарашкевіч быў адным з кіраўнікоў, уваходзячы ў яго Управу (ня толькі не належаў да „Управы", але не ўваходзіў навет у Надзорчую Раду!—*Рэд.*). Урэшце, ён перахоўваў у сябе праступную літэратуру—з мэтай яе пашырэньня.

Другім паслам, апрача „кіраваньня змовай", закідаецца яшчэ: п. Раку Міхайлоўскаму і Валошыну, што яны падбуралі народ да аружных выступленьняў; п. Мятле, што ён арганізаваў баёўкі ў Дзісьненшчыне.

Дакладчык лічыць, што ўсе гэтыя абвінавачэньні маюць падставу ў дакумэнтах (?), што праступленьні гэтыя—не палітычныя, а чыста ўгалоўныя, і што арышт не нарушыў § 21 Канстытуцыі, бо паслы схоплены „на гарачым учынку", усьцяж бясспынна вядучы гэтую акцыю. Сойм, кажа ён, павінен выдаць паслоў.

Цікаўны тыя матывы, якімі дакладчык націскаў на сумленьне маючых галасаваць паслоў:

„Сойм і без таго ня мае пашаны ў грамадзянстве — за ўсё тое зло, што ён рабіў, дык ня трэба, каб яму закідалі, што ён пакрыў здрайцаў Польскай Дзяржавы. Гэта-ж—не ў інтарэсе Сойму і польскай дэмакратыі!".

Пас. Рагуля зьбіваў доказы пракурора, кажучы, што ўсе „сьведкі — платныя правакатары"...

Жыдоўскі пас. Шрэйбэр, сябра камісіі, разглядаўшай „матэрыялы", сьцьвярджае, што Камісіі ніякіх даводзячых матэрыялаў ня дадзена. Падстава абвінавачаньня—гэта „паказаньні агентаў, якія самі былі караны за злачынствы". Аб якім-сь „угалоўным праступленьні" тут ня можа-ж быць навет мовы. Няма ніякіх доказаў „шпіёнскай дзеяльнасьці паслоў". Ня мела мейсца і „схапленьне на гарачым учынку", бо навет, калі прызнаць, што „праступленьне ў цэлым мела цяглы, зьвязаны характар", дык ўсе-ж складалася яно з паасобных праступных мамэнтаў, дык і трэба-ж было схапіць праступніка хаця б на адным з іх. Дзеля таго—прапануе адаслаць справу ў новую камісію з 3 паслоў, якой урад даў бы доказы віны.

Эндэк **Марвэт**, кажа, што камісія грунтоўна разглядзела справу, і эндэцкі клюб, хаця стаіць у апазіцыі да ўраду, аднак-жа прыхіляецца да яго дамаганьня—выдаць паслоў суду. Кажучы аб канфэрэнцыі якраз у Гданску, эндэк—немцаед кажа, што ўжо з гэтага ясна, хто ўзапраўднасьці кіруе ўсей антыпольскай акцыяй: гэта кіраўнік — значна магутнейшы за тую дзяржаву, аб якой мы тутака гутарым. „Можна шанаваць нятыкальнасьць паслоў, але—яшчэ даражэй для нас—нятыкальнасьць граніцаў Польшчы".

Пас. **Бальлін**. Нам закідаюць тэрор, арганізацыю забойстваў... Мы заяўляем, што за ўсё тое, што рабіў п. Галавач, мы бяром цалком адказнасьць на сябе, бо-ж нічога з таго, што нам закідаецца, не даведзена.

У часе прамовы Бальліна старшыня некалькі разоў рабіў яму ўвагі—за паняверку годнасьці Сойму.

Камун. **Сохацкі** заявіў, што ніякія рэпрэсіі ня стрымаюць Камуністычную Партыю ад спаўненьня яе рэвалюцыйных абавязкаў.

Пасол **Лібэрман** ППС. — (Прамову п. Лібэрмана падаем у скарочаньні паводле „Роботніка"). Камісія разглядзела падробна ўсё, што было ей прадстаўлена пракуратурай. Большую частку часу камісіі заняло разважаньне справы—на падставе масы брашураў, кніжак, пісаных паказаньняў. Але гэтых кніжак мы ня чыталі, а асобаў, даваўшых гэтыя паказаньні, мы **ня бачылі дый прозьвішчаў іх ня ведаем**... Той, хто мяне назваў „патэнтаваным абаронцам камуністаў", забыўся аб тым, як мяне назвалі яго таварышы тады, калі я бараніў ад выдачы суду 3 паслоў правіцы, абвінавачаных у паважным палітычным праступленьні. Як тады, так і цяпер, мы стаім на тым, што Сойм не павінен выдаваць паслоў за палітычныя праступленьні.

Я ішоў у камісію, думаючы, што ўсё-такі ўрад мае хаця б якія-небудзь доказы праступнасьці паслоў, аб якой цьвярдзілі ўрадавыя камунікаты. Праз увесь час працы ў камісіі я ўсьцяж пытаўся ў пракурора, ці ёсьць якія запраўдныя падставы дзеля абвінавачаньня паслоў у ваенным шпіёнстве і гэтай „платнай службе на карысьць суседняй дзяржавы".

На ўсе мае запытаньні пракурор дасЛоўна адказаў: „Абвіненьне ў шпіёнстве апіраю на гэткім разумаваньні".

Я ня меў патрэбы слухаць далей. „Мне здаецца, што, калі пасла вінаваціць у шпіёнстве, дык трэба-ж гэты цяжкі закід абаперці не на „разумаваньнях", але перадусім—на фактах".

Я націскаў далей: „Якія маеце факты ваеннага шпіёнства,— хто, калі шпіёніў?—Аб якіх дакумэнт ды рэч яму йшло. — аб якую разьведку?". На гэта міністар справядлівасьці знайшоў толькі гэткі адказ: „Уся атмасфэра была шпіёнская".

Дык, панове, закон карае—не таго, хто жыве ў данай „атмасфэры", не за тое, што ён дыша гэтай „атмасфэрай", але—за ясныя факты шпіёнства, разьведкі, службы".

Я зьвяртаўся да дакладчыка, да ўсей Камісіі, каб мне паказалі хаця-б адзіны факт шпіёнства, заяўляючы, што тады я падам голас за выдачу паслоў. Але, апрача „атмасфэры", ніякіх фактаў ніхто паказаць ня мог.

Тады я хацеў сьцьвярдзіць доказы другога пункту абвіненьня: платная служба суседняй дзяржаве.

На гэта я атрымаў адказ: „Адзін з паслоў меў у Банку 500, другі 300, трэці—400 даляраў... Панове,—шмат хто з паслоў мае ўклады ў банках.

Голас п. **Станьчыка** (ППС) За гэта мы павінны-б былі выдаць суду ўсю правіцу цалком!

Пас. **Лібэрман**: Самыя ўлады яшчэ ня кажуць нічога. Тады мне дадалі: маем сьведкаў. Тады я стаў дапытывацца: што гэта за сьведкі, якая іх прафэсія? Адказывалі: „селянін", ці часам інакш. **Але прозьвішчаў не падавалі**".

Чаго варты гэтыя сьведкі, даю прыклад.—Адзін сьведка цьвярдзіў, што сам быў пры тым, як урадовец суседняй дзяржавы даў паслу Тарашкевічу 15.000 даляраў. Дык вось, паслухайце паны: пракуратар заявіў, што ў яго ёсьць сьведка, які быў так блізка да ўсей гэтай справы, меў такое даверые ў абедзьвюх старон: суседняга пасольства і п. Тарашкевіча, — што быў прысутны пры такой тайнай рэчы, як атрыманьне п. Тарашкевічам з рук суседняга агента 15.000 даляраў! А пасьля пайшоў... і заявіў аб гэтым п. міністру справядлівасьці...

Верыць такім „сьведкам" — справа сум-

леньня кожнага... Я-ж прызнаюся — не магу лічыцца з такімі „паказываньнямі“...

Ня можна-ж, паны паслы, выбраць сабе 5 нямілых паслоў (для мяне яны — таксама нямілыя!), дый сказаць, што яны — ваенныя шпіёны, — бо п. Тарашкевіч атрымаў 15.000, як данёс гэты „сьведка“.

Я лічу агіднымі і трэбую кары за гэткія найцяжэйшыя праступленьні, але—тым больш трэба даць паважныя доказы, што яны рабіліся. А гэтага якраз няма. Замест таго ёсьць бясспрэчнае нарушэньне канстытуцыі.

Дзеля таго не знаходжу ў сваім сумленьні ніякіх падставаў дзеля галасаваньня за выдачу, бо гэткіх падставаў няма ў прадстаўленым нам матар‘яле. „Я і мая партыя галасуем проці выдачы“.

Вынікі галасаваньня ўжо нам ведамы.

Справа пас. Воевудзкага.

Сьведка Аляксюк.

„Дзен. Віл.“, паведамляе, што на найбліжэйшым паседжаньні маршалкоўскага суда над паслом Воевудзкім маюць даваць паказаньні: рэфэрэнт II Аддзелу 3-га корпусу і—Аляксюк. — Аляксюк які, (даслоўна) — „прымаў учасьце у арганізаваньні выбарнай акцыі „Вызваленьня“ на „Крэсах“, арганізаваў беларускія зьезды і быў у блізкай сутычнасьці з II аддзелам Ген. Штабу.

Пісьмо пасла Воевудзкага да Марш. Пілсудскага.

Пас. Воевудзкі паслаў п. міністру ваенных спраў марш. Пілсудскаму пісьмо гэткага зьместу:

„Пане міністар, пераглядаючы свой асабісты архіў, я знайшоў у ім розныя крыжы ды адзнакі, якія сьведчаць аб маей прыналежнасьці да польскага войска і арганізацыяў, на чале якіх стаялі Вы, пане міністар“. Аўтар пералічае цэлы рад крыжоў ды „адзнакаў заслуг“ сваіх перад Польшчай, а далей піша: „Я ясна разумею, што ўсе гэтыя адзнакі дадзены мне Панам тады, калі я быў у лагеры пілсудчыны, які лічыў тады лагерам народнай Польшчы... Дзеля таго, што гэты лагер стаўся цяпер лагерам фашызму, абозам сьмяротных ворагаў працоўнай Польшчы,—адсылаю Пану назад усе гэтыя крыжы і адзнакі“.

Пэпэсаускае махлярства.

Пэпэсы вядуць палітыку на два фронты: на дзеле падтрымліваюць сучасны ўрад, ды адначасна гучна выступаюць проці яго... ў прамовах і газэтных артыкулах, заяўляючы аб сваім „пераходзе ў прынцыповую, чэсную і адкрытую апазіцыю“. Ведама, першае робіцца для ўраду, а другое—для „выбаршчыкаў“ работнікаў. Ад часу гэткай „апазіцыі“ пэпэсы ўвялі вельмі спрытны спосаб публікаваньня прамоваў сваіх сяброў у Сойме.—Яны ўжо не даюць цалком гэтых прамоваў—паводле стэнаграмаў, як заўсёды рабілі раней, а даюць толькі спрытна „апрацаванае“ іх „скарочаньне“. У гэтым „скарочаньні“ ўсе выражэньні, якія маглі-б неспадабацца работніку ды адразу раскрыць яму вочы на „адкрытую апазіцыю“ пэпэсаў, старанна выкідаюцца. Наадварот, пакідаюцца больш „моцныя“ мейсцы Напрыклад, апошняя прамова п. Недзялковскага, мастака „дэлікатнага апазіцыйнага стылю“, у абшарніцкай „Варшавянцы“ была надрукавана ў вялікшым аб‘ёме, як у „Работніку“. А ў гэтай прамове якраз знайшліся чысьленыя салодкія камплімэнты Марш. Пілсудскаму—побач з вострай крытыкай“ яго „оточэньня“ і ўраду.

Барацьба за волю у Кітаі.

Завастрэньне барацьбы ў Кітаі і англійска-радавых адносінаў.

Англійская прэса абвясьціла, быццам амэрыканскі і італьянскі ўрады рашылі падтрымаць Англію ў яе дамаганьнях ад кантонскага ўраду. Амэрыка быццам мае паслаць у Кітай 10.000 маракоў і 3.500 пяхоты, калі Кантон ня згодзіцца на нэйтралізацыю Шанхаю. Быццам пастанавіла рашучаісьці побач з Англіяй ды Амэрыкай такжа і Японія.

8 лютага ў кітайскія воды прыбылі яшчэ 4 англійскія крэйсэры. Ідзе шмат караблёў японскага і італьянскага флётаў — з значнай лічбай аэрапляпаў. Адначасна англійскія міністры выступаюць з вельмі ваяўнічымі прамовамі ня толькі проці Кітаю, але і—проці СССР. Партыя актыўнай барацьбы з СССР, на чале якой стаяць міністры Чэрчыль, Бэркэнжэд і Гікс, усё больш забірае ўплыў на ўрад, дамагаючыся ў першую чаргу — сарваньня дыпляматычных зносінаў з СССР і высылкі з Англіі радавых тарговых дэлегатаў. З другога боку, і радавая дэлегацыя ў Лёндане шпарка ліквідуе свае справы і сувязі з Англіяй,—каб быць у кожны мамэнт гатовай да выезду.—Толькі-што яна выбрала з англійскіх банкаў на паўтара мільёна фунтаў золата, а цяпер ізноў папярэдзіла банкі, што забярэ і далейшыя ўклады.

У сувязі з напружанай атмасфэрай, пагражаючай выбухам, зрабілі важныя папераджаючыя выбух заявы прадстаўнікі кітайскай і радавай дыпляматыі—мін. Чэн і Літвінов.

Міністар загран. спраў Кантонскага ўраду Чэн заявіў англійскаму паўнамоцніку ў Ханькоў, што ўрад не адкідае праекту ўмовы з Англіяй і што бярэ на сябе поўную адказнасьць за ахову чужаземцаў на канцэсыйных тэрыторыях. Толькі ўрад лічыць небясьпечным далейшую высадку чужаземных войскаў на тэрыторыю Кітаю, бо гэта-ж муciць выклікаць выбух, які трэба папярэдзіць.

Заступнік камісара загран. справаў Літвінов зрабіў прадстаўнікам прэсы гэткія заявы, маючы на мэце перадусім — „інтарэсы сусьветнага міру і добрыя адносіны паміж Англіяй і СССР“.

Літвінов сказаў, што Англія сама нарабіла абмылак у Кітаі, заўсёды—замест дапамогі кітайскаму народу ў яго вызваленьні—страшучы Кантон аружным нападам на Кітай. За гэтую абмылку Англія і заплаціла вельмі дорага. Але цяпер англійскія рэакцыйныя кругі віну за тое, што нарабілі самі, ускладаюць на ўрад СССР. Радавы ўрад не ўкрывае зусім сваіх сымпатыяў да вызвольнага руху ў Кітаі, але гэта-ж ня значыць, што гэты рух „выклікаНы радавымі агентамі“. Радавы ўрад добра памятае аб сваіх дагаворных абавязках перад Англіяй, якой так сама карысны добрыя адносіны з Радамі. Радавы ўрад даў ужо столькі доказаў свайго міралюбія як на захадзе, так і на ўсходзе, што ня трэба падчырківаць залішне ягонага жалю з прычыны кітайскіх здарэньняў.

У канцы Літвінов выразіў надзею, што разумнейшыя элемэнты англійскага грамадзянства пераможуць, разумеючы, што „палітыка „браніраванага кулака“ ніколі ня прыносіла народам нічога, апрача бяды“...

Пратэст СССР проці англійскага паходу на Кітай.

Пасьля таго, як ободва кітайскія ўрады—Чанг-Тсо-Лін у згодзе з Чырвоным Кантонам—рашуча выказаліся проці масавай высадкі англійскіх войскаў на кітайскую тэрыторыю, падтрымаў гэты кітайскі пратэст і радавы ўрад.—Заступнік Чычэрына Літвінов, заявіўшы, што выступае ў абароне сусьветнага міру ад магчымай небясьпекі, запратэставаў проці таго, што самі англійцы, высаджываючы сваі войскі на кітайскую зямлю, робяць немагчымымі згары тыя перагаворы, якія, можа, маглі-б давясьці да паразуменьня з кантонскім урадам.

Радавыя войскі на Мукдэнскай граніцы.

У Лёндане вельмі занепакоены канцэнтрацыяй вялікай масы радавых войскаў удоўж Манчжурскай граніцы—на поўнач ад Мукдэну. Адначасна англійскае тэлеграфічная агенства Рэйтэра даносіць, што радавы ўрад зачыніў усходня-сібірскі чыгункавы шлях, не падаючы прычын гэтай меры.

Бяссільнае абурэньне проці СССР.

Англійская буржуазная прэса страшэнна націскае на англійскі ўрад, каб рашуча парваў з Радамі ды выслаў з краю прадстаўніцтва.—Бо ж запраўдная барацьба ў Кітаі ідзе быццам ня з кітайскім народам, але з маскоўскім урадам. У лоне ўраду пачалася барацьба між староньнікамі і праціўнікамі вайны з Радамі. Але чамусьці, пасьля некалькіх ваяўнічых прамоваў англійскіх міністраў, уся грозная справа „аб‘яўленьня Англіяй вайны СССР“ — скончылася на паўафіцыяльнай заяве англійскага ўраду, што ён „ня мае думкі спыняць дыпляматычныя зносіны з СССР“. Як ні дзіўна, гэткае становішча англійскага ўраду выклікана націскам буйнейшай прамысловай і фінансавай буржуазіі Англіі, якая мае вялізарныя інтэрэсы ў Кітаі дый ня траціць надзеі на паразуменьне з Кітаем—шляхам папярэдняга паразуменьня з Радамі... З кругоў гэтай буржуазіі ідзе думка аб склікаваньні новай канфэрэнцыі з радавым урадам—дзеля вырашэньня ўсіх спорных спраў...

Новы ваенны пасьпех кантонскай арміі.

Кантонская армія, пасоўваючыся ў напрамку Шанхаю, заняла важны стратэгічны пункт Ліянг.

Прапазіцыя зрабіць Шанхай „нэйтральным“.

Амэрыканскі ўрад даручыў свайму паслу ў Пэкіне запрапанаваць ваюючым за Шанхай старонам—згадзіцца на прызнаньне ўсей тэрыторыі чужаземных канцэсіяў у Шанхаі—„нэйтральнай тэрыторыяй“, на якой не маглі-б вясьціся ніякія ваенныя апэрацыі. Сумліўна, каб кітайскі народ, вызваляючы сваю зямлю ад чужаземнага ярма, згадзіўся на гэта.

Двулічнасьць Чанг-Тсо-Ліна.

Японскі найміт Чанг-Тсо-Лін даўно вядзе ігру на два фронты: быццам бароніць нацыянальнае адзінства і незалежнасьць Кітаю, але адначасна трымае—за грошы ворагаў кітайскага народу — вялізарную армію дзеля барацьбы з вызвольных яго рухам.

Толькі-што газэты паведамілі, што ён заявіў афіцыяльны пратэст перад амэрыканскім паслом у Пэкіне проці зьбору амэрыканскага флёту ў Шанхайскім порце. Але адначасна, як пішуць газэты, неафіцыяльна не радаў гэтаму паслу, што—вельмі здаволены наагул паяўленьнем чужаземных войскаў у Кітаі, бо гэта значна аблягчае яму—барацьбу з кантонскім урадам...

Англія паразумелася з Мусоліні.

Англійская буржуазная прэса страшэнна дзякуе мін. Чэрчылю, які ў часе сваей візыты да Мусоліні намовіў яго да супольнай і згоднай акцыі ў Кітаі з Англіяй. Вялікае здаволеньне выклікала ў англійцаў вестка аб тым, што Мусоліні ўжо выслаў у Шанхай найвялікшы крэйсэр свайго флёту—з 1.500 жаўнерамі.

Англійская Індыя проці англійск. авантуры.

З Калькутты (Індыя) даносяць, што ў шмат мясцох адбыліся бурныя маніфэстацыі проці ваеннай авантуры Англіі ў Кітаі. У самай Калькуце дэманстрацыя сабрала да 8.000 асоб...

У часе мітынгу пратэсту гаварыліся прамовы, у якіх індыйскія войскі, пасланыя ў Кітай, былі называны ахвярамі англійскага імпэрыялізму, і прамоўцы заклікалі ўсімі мерамі актыўна перашкаджаць далейшай высылцы войск у Кітай.

Пэкінскі ўрад апэлюе да Лігі Народаў.

Пэкінскі ўрад упаўнамочыў сваіх прадстаўнікоў у Эўропе, каб яны намовілі некаторыя дзяржавы-сяброў Рады Лігі народаў—падняць кітайскую справу ў Лізе—на яе сакавіковай сэсіі Рады.

Запраўды, ці-ж не нячуваны скандал, што проці Кітаю, які ўваходзіць у склад Лігі Народаў, фактычна рыхтуецца ваенны паход, ладжаны тымі-ж вялікімі імпэрыялістычнымі дзяржавамі Эўропы, што зьяўляюцца фактычнымі кіраўнікамі Лігі і пануюць у яе Радзе. Няма лепшага доказу поўнага маральна-палітычнага банкруцтва гэтай Лігі!

На вестку аб гэтым кроку Кітаю вельмі ўзварушылася Англія. Яе прадстаўнікі ў Лізе паднялі вострую кампанію проці дапушчэньня ў Радзе разгляду кітайскай справы. Толькі адна англійская партыя—работніцкая выказалася за дапушчэньне.

У Польшчы.

Ізноў „распачалася“ ды — скончылася на нічым!...

Газэты гучна паведамілі:

У панядзелак распачалася 3-дзённая сэсія „Камітэту знаўцаў спраў нацыянальных меншасьцяў“...

Што ж зроблена „сэсіяй“?...

„У аўторак — пад старшынствам самага міністра асьветы — адбылася ізноў паседжаньне. Прадметам паседжаньня была справа пачаткавога школьніцтва на „крэсах“, а перадусім — беларускага“. Разгледжаны далейшы матар‘ял у гэтай справе і — узгоднены пагляды... — „Ніякіх рэзалюцыяў ані прапазыцыяў ня прынята“.

Што было ў сераду, яшчэ ня ведама. Але і так ці-ж мала зроблена за два дні працы?!... Відаць, урадавыя „знаўцы спраў крэсавых“ дагэтуль нічагусенькі аб справе беларускага школьніцтва ня чулі — ня ведалі — за 2 — 3 гады істнаваньня „Сэкцыі Камітэту“...

Новая „шпіёнская афэра“ ў Віленшчыне.

Польская прэса паведамляе, што дэфэнзыве і паліцыі ўдалося выкрыць новую шпіёнскую арганізацыю, якая працавала на нашых „крэсах“. „Шпіёны, падкупленыя Менскам, знайшліся сярод вайсковых, урадоўцаў, чыгуншчыкаў і цывільных асобаў. Акцыя ліквідацыі гэтай афэры, якой „было дазволена дасьпець“, закончана ў працягу апошняга тыдня. На падставе зробленых обыскаў і знойдзенага матэрыялу арыштаваны ўсяго 16 асоб, у тым ліку — 5 вайсковых, 5 урадоўцаў чыгункі, рэшта — „цывілі“. „У часе рэвізіі знойдзена аружжа, трыманае без дазволу і... атрыманае з Менску“(!) „Дзен. Віл.“ дадае, што выкрытая арганізацыя — „адна з найбольш небясьпечных, якія толькі былі

Ляо-Дзе.

ВАРОНЫ і КАРШУНЫ.

(КАЗКА).

І пачулі раптам адкульсьці вароны, што побач на Усходзе ёсьць вялікае арлінае царства, дзе правіць не арліны збор, а адзін цар арол.

— „Там пэўна варонам лепей жывецца!“—думаюць сабе вароны. — „Вось каб ды арлы раптам зваявалі нашых каршуноў, — тады-б мы вальней уздыхнулі“.

— „Падурэлі вы, ці што?!. кажа ім сярэдніх гадоў варона. — „Каршуноў і падліз трэба пазбыцца сваімі сіламі, тады толькі нам і зажывецца лепш. А калі-ж толькі каршуноў пераможа Арол з арлянятамі, то нам ад гэтага ані капелькі лягчэй ня будзе“.

— „Чаму“? — пытаюцца некаторыя вароны.

— „А таму, што і ў арліным царстве вароны, як і мы, прыгон служаць“.

Рашылі ўсёткі вароны самім спрабаваць скідаць з свайго карку каршуноў і падліз. І вось у назначаны час падняліся на ўсім табары вароны на каршуноў і падліз. Доўга біліся вароны з каршунамі і падлізамі,—ляцела па ветру пер‘е і пух як адных, так і другіх, зрываліся з сучкоў гнёзды, валіліся далоў голыя малыя дзеці. Быў час, што, здавалася, вароны пераможуць сваіх праціўнікаў. Аднак, вышла ня гэтак: вароны неяк замітусіліся, а ў гэты мамэнт ім селі на карк ізноў каршуны ды падлізы і пачалі сваю дзікую расправу.

Дорага каштавала гэта спроба варонам, але і каршунам з падлізамі яна была ня менш балючая. Прыціхлі вароны, зьбіраюць толькі чарвякоў, ды пашчупаваюць на сваім целе пабітыя месцы. А каршуны давай вадзіцца з падлізамі, хто з іх даў занадта многа волі варонам, ды не дагледзіў, як яны згаварваліся. Лаяліся, лаяліся, дый учапіліся адны адным у пер‘е.

— „А, дык вы гэткія“?!. крычыць адзін каршун.—„Дык вы проціў нас, старэйшых, бунтаваць уздумалі?!. Пачакайце ж вы“!.. і паляцеў на ўсход да цара арла.

„Так і так, найясьнейшы пане, прышлі падмогу“.

А цар-арол гэтага толькі і чакаў. Кіўнуў ён капцюром сваей лапы, стукнуў дзюбам, і цэлая хмара арлінага войска рушыла на каршуньняе ўладаньне. Наляцелі, як бура; і, пакуль каршуны і падлізы сьцямілі, у чым справа, арлы ім ужо крыльле паламалі.

— „Ну, цяпер нам палягчэе“!—кракнула якаясь варона. — „Што арлы — то не вароны“.

Але палягчэньня варонам арлы не прынясьлі, ды і не маглі яго прынясьці, бо ў іхнім царстве вароны таксама прыгон служылі. Засеўшы ў старым вароньнім і каршуньнім табарышчах, арлы пазабіралі там сабе пад гнёзды найпрыгажэйшыя дрэвы, ды прыказалі часьць зношаных варонамі для каршуноў і падліз чарвякоў і курчат аддаваць ім.

Не спадабалася гэта каршунам і падлізам,—шкода ім чужой працай дзяліцца з якімісь іншымі разбойнікамі; і пастанавілі яны з каршуньняга і вароняга табарышчаў выгнаць арлоў. Спрабавалі яны гэта зрабіць раз, спрабавалі другі і трэці — дарэмна! Ня скінуць ім арлоў з свайго карку. Заціхлі яны і паволі пачалі рабіцца самі арлінымі падлізамі ды вартаўнікамі, але ад гэтага толькі цяжэй стала жыць варонам.

Гора варонам дый толькі.—Накармі арлоў, накармі каршуноў, накармі падліз, ды ўсіх яшчэ і не абы як, а самім хоць ты з голаду здыхай!

І рашылі вароны ўсяго вялікага арлінага царства пабіць і арлоў, і каршуноў і падліз. Крык падняўся вялікі збунтаваных варон на ўвесь сьвет; яшчэ больш крычаць арлы аб „сваей крыўдзе“ ад варон Ломяцца ў бітве крыльлі варон, але ня мала і арлоў ды каршуноў ужо ляжыць з расквашанай галавой, поўзаець з паламанымі крыльлямі, а змагчы варон арлам, каршунам і падлізам не ўдаецца ніяк. Кінець арліны цар свае войска ў адно места, душыць вароньняе паўстаньне, аж глядзіш: пакуль войска дайшло туды, ужо ў іншым месцы пабілі арлоў і іхніх падліз.

Бачыць цар арліны, што кепская справа: саб‘юць вароны арлоў, ды каршуноў з падлізамі, а тады, чаго добрага, і да яго дабяруцца! Рашыўся ён даць волю варонам, — каб хоць гэтым паказаць, што ён добры. І вось аб‘явіў ён варонам праз сваіх верных слуг, што вароны з гэтага дня маюць поўную волю: могуць у сваім табарышчы і па ўсім арліным царстве куды хочуць лётаць, могуць навет здалёку паглядаць на лясы, вёскі і палі, але толькі не садзіцца там і жыру ня зьбіраць: на гэта, бачыце, патрэбен асобны дазвол таго арла, каршуна, ці падлізы, а то і самога цара, каму гэты лес, луг, ральля ці вёска належыць.

— „А мы-ж з чаго і дзе маем жыць“? пытаюцца вароны.

— „Якія вы не цярплівыя! Хочаце, каб вам усё так адразу і далі?“ — адказывае ім цар арліны. — „Уладжу вось усё з арламі, каршунамі ды падлізамі, тады і зноў аб вас падумаю?..

І пачалі вароны ждаць. Ждуць год, два, тры—маўчыць штосьці аб іх цар. А тым часам царскія чыноўнікі ўсю зямлю пахатную, лепшыя лугі, вазёры, вёскі і мястэчкі арлам, каршунам, ды падлізам падзялілі.

— „А вам-жа што застанецца?—пытаюцца зноў вароны.

— „Вам?.. А гэта што: бачыце, ці не“?—адказываюць каморнікі. — „Вось і вам зараз дадзём“. Паставілі столікі і давай мерыць сыпучыя пяскі ды балоты.

— „Але-ж тут ані чарвяка, ані жука ня знойдзем!.. На гэткіх надзелах мы з голаду падохнем“!.. крычаць вароны.

— „Ня хочаце, ня трэба!“—адказываюць ім царскія служкі. „Цяпер вы свабодныя і можаце па ўсім царстве жыць, як вам падабаецца. А хто хоча дастаць надзел зямлі, то калі ласка: расьпішыцеся, што на працягу паўсотні гадоў будзеце ад кожнага надзелу даваць у царскую казну па тры бочкі чарвякоў і па бочцы курчат, ды што бяз ведама гаспадароў арлоў, каршуноў і падліз на іхнюю зямлю лазіць ня будзеце“.

— „Але-ж, яснавяльможныя паночкі, гэта зямля ня іх! Яна ў нашых дзядоў ашуканствам адабрана! Яна, значыцца, наша“!—Моляцца вароны:

„На такіх абшарах, якія застаюцца каршунам і падлізам, ніхто сам адзін ўсіх чарвякоў і жукоў не сабярэ і яны дарма будуць толькі прападаць“! крычаць іншыя.

— „Гэта — зямля ім ад бацькоў іхніх дасталася“ — адказывае ім старшы служка цара-арла.

— „Яны вас наймуць, кажуць іншыя служкі таго-ж цара.

Пачасалі вароны патыліцы, пачасалі; бачаць, нічога пакуль-што ня зробіш — кругом крупяцца слугі цара-арла, каршуны ды падлізы. Згадзіліся вароны з сваім лёсам ды падпісалі патрэбныя арлам паперы і пачалі жыць на сваіх пяскох ды балотах.

Ходзіць, ходзіць варона па пяску цэлы дзень, зьбярэ якіх пяць-шэсьць чарвякоў і хоча ўжо іх нясьці сваім дзяцём; а служка цара-арла ўжо тут:

выкрыты на крэсах".— Арганізацыя мела выкрыць сэкрэтную сець вайскова-камунікацыйнай лучнасьці ў краі.

Калі обстава газэта ня валіць афэры на беларускую галаву, дык значыць арыштаваныя ўсе „сваі".

А вось „дэмакратычны" орган „Кур. Віл." далей ня выцярпеў і гэту справу стараецца прыпісаць „Грамадзе"! Прынамся ў № 32 паны пілсудчыкі заяўляюць, быццам два з арыштаваных учасьнікаў шпіёнскае арганізацыі належалі да „Грамады", а адзін зьяўляецца сэкрэтарам Т-ва Беларускае Школы...

Добрая „маральная санацыя", калі Обставая газэта дае паном „дэмакратам" прыклад... чэснасьці!

„Украінская шпіёнская афэра".

Газэты падаюць вестку аб выкрытай у Львове „ўкраінскай шпіёнскай афэры". Быццам у ліку арыштаваных сяброў арганізацыі знаходзяцца два браты Вежбіцкія, якія, — як „сцьверджана паліцыяй", — былі спраўцамі забойства Львоўскага школьнага куратара Собіньскага...

Ваявода Рачкевіч у Варшаве.

„У зьвязку з палажэньнем Краю пасьля апошніх здарэньняў", як піша „Dzien. Wil.",— ваявода Рачкевіч езьдзіў у Варшаву, дзе адбыў доўгую гутарку з міністрам унутр. спраў.

Скасаваньне сэрвітутаў.

П. Прэзыдэнт Рэспублікі, як паведамілі газэты, надпісаў ужо дэкрэт у справе скасаваньня сэрвітутаў на абшары былой расейскай часткі Польшчы. Гэты дэкрэт мае зараз-жа зьявіцца ў „Дзеньніку Устаў". Выканаўчае распараджэньне да дэкрэту таксама ўжо апрацавана мін. Зямельных Рэформаў у паразуменьні з адноснымі міністрамі (чытай: п. п. Незабытоўскім і Мэйштовічам) і таксама хутка будзе апублікавана.

Ведама, што ў справе ўрэгуляваньня сэрвітутаў страшэнна заінтэрэсаваны, апрача абшарнікаў, таксама і мільёны нашага сялянства. А вось вырашэньне гэтай справы аддадзена ў рукі выключна аднэй заінтэрэсаванай стараны. Бо-ж ні для каго ня тайна, што вырашўшыя справу міністры, — гэта-ж паўнамоцнікі буйнай зямельнай уласнасьці, дый яшчэ—з нашых беларускіх крэсаў... Хто бараніў у гэтых „адносных міністэрствах", ці ў канцэлярыі п. Прэзыдэнта інтарэсы беларускіх сялян, якія вядуць гэты векавы сацыяльна-цывільны спор з абшарнікамі,—няведама...

Гаспадарчае адасабленьне Польшчы.

Нямеччына вядзе пляновую, добра абдуманую акцыю ў напрамку — гаспадарчага, а ў выніку гэтага—і палітычнага адасабленьня Польшчы,—пазбаўляючы яе рынкаў збыту.

Дагэтуль трывае (ўжо трэці год...)—эканамічная вайна паміж Польшчай і Нямеччынай, якая ўлетку 1925 г., як ведама, зьявілася аднэй з галоўных прычынаў першага—зламаньня польскай валюты. Цяпер польска-нямецкія адносіны, трэба думаць, яшчэ пагоршацца, дык на спыненьне гэтай „вайны" спадзявацца цяжка.

Нямецка - чэхаславацкае паразуменьне, як ведама, мае мэтай увясьці Чэха-Славакію у круг нямецкай гаспадарчай палітыкі. Чэха-Славакія пляново заваёўвае балканскія рынкі, выціскаючы адтуль польскія тавары. Далучэньне Польшчы да агульна эўрапэйскага жалезнага трэсту таксама адкладаецца: Нямеччына і Чэха-Славакія працівяцца гэтаму. Рынкі ў СССР сам польскі ўрад зачыняе для Польшчы—сваей палітыкай... Балтыцкія рынкі заваявалі ў значнай меры немцы. А толькі-што англійскае вугальле выціснула польскі вугаль, як даражэйшы, — ва швэдзкага рынку...

Усё гэта, ня кажучы ўжо аб шмат іншых прычынаў, — паволі, але няўхільна падрыхтоўвае набліжаючуюся фінансава-гаспадарчую катастрофу.

Перашкоды ў польска-нямецкіх таргоўых перагаворах.

Стварэньне новага цэнтра-правага ўраду ў Нямеччыне значна ўтрудніла ўзнаўленьне таргоўых перагавораў між Нямеччынай і Польшчай. Перагаворы даўно стаяць на мёртвым пункце.

У сваей прамове ў Рэйхстагу, пасьля экспозэ новага ўраду, павадыр нямецкіх нацыяналістаў, атрымаўшых кіраўнічую ролю ў гаспадарчай палітыцы Нямеччыны, заявіў ясна і проста, што—ня можа быць мовы аб заключэньні таргоўага дагавору з Польшчай, пакуль яна ня прыме пэўных палітычных варункаў, якія заўсёды зьяўляюцца падставай для гаспадарчых зносінаў паміж дзяржавамі.

Зьезд „Партыі Працы".

Урадавая „Партыя Працы" зрабіла 6—7 лютага ў Варшаве першы зьезд прэзэсаў ваяводзкіх аддзелаў партыі. Старшынёй зьезду быў пас. Косьцялкоўскі. Зьезд прыняў рэзалюцыі, у якіх перадусім выразіў поўнае даверые сучаснаму ўраду і яго палітыцы ўнутранай і вонкавай. Далей зьезд трэбуе — „аздараўленьня" крэсавай адміністрацыі (здаецца, — нічога сабе — здаровая!...), апекі над працуючай інтэлігенцыяй, доўгасрочнага крэдыту для прамысловасьці, гандлю, рамясла і земляробства і — ўпрашчэньня падаткавай сыстэмы. Зьезд зьвярнуўся — да ўсяго сярэдняга і дробнага мяшчанства з заклікам да аб'яднаньня і самаарганізацыі. У канцы, зразумела, былі пасланы тэлеграмы з выражэньнем даверыя і пашаны да п. п. Прэзыдэнта, прэм'ера, віцэ-прэм. і міністра асьветы.

З гэтага відаць, што, рыхтуючыся да выбараў, „Партыя Працы" аб'яўляе сябе прадстаўніцай інтарэсаў клясы сярэдняга і дробнага мяшчанства... Ці пойдзе ў партыю гэтая даўней эндэцкая армія?

Ізноў узрост безрабоцьця!

Паводле афіцыяльных даных, за тыдзень 22—29 студзеня безрабоцьце ў Польшчы навялічылася на 2.518 душ, дасягнуўшы ўжо лічбы 251.702 душ.

„Галодная" хроніка Варшавы.

„Роботнік" наказуе, што за тыдзен ад 31 студзеня да 5-га лютага ў Варшаве самлелі на вуліцы 3 асобы, а 7 з голаду налажылі на сябе „рукі". Разам з папярэднім тыднем усяго — „23 ахвяры Цара — Голаду ў сталіцы дзяржавы — пад бокам цэнтральных уладаў.

Заграніцай.

Што робіцца ў Латвіі.

Фашыстаўская зараза, трыумфуючая ўжо ў двух балтыцкіх дзяржавах, пачала шпарка пашырацца і ў трэцяй. Буржуазныя кругі пад націскам тых-жа англійскіх дарадцаў, якія прычыніліся да перавароту у Польшчы і Літве, — паднялі ў Латвіі кампанію за перагляд канстытуцыі — у напрамку „ўзмацненьня ўлады прэзыдэнта", „унешкадлівеньня парлемэнтарызму" і г. д. Ясна, што ўсялякія авантуры, асабліва ваенныя, найспакайней дасьпяваюць утайне ды ўцішы, чаму заўсёды парашкаджае кантроль з боку парлямэнтаў. Вось чаму Англія так любіць у сваіх „незалежных" калёніях — „рабіць каралёў", ды так ня любіць парлямантаў.

У зьвязку з гэтай акцыяй у Латвіі радавая прэса адзначае, што латвійскія фашысты рыхтуюцца яўна да рашучага ўдару. Але напалову сацыялістычны латвійскі ўрад быццам ня бачыць гэтага, скіроўваючы ўсю ўвагу на барацьбу з левымі работніцкімі арганізацыямі. „За плячыма латвійскіх фашыстаў стаіць імпэрыялістычная Англія, якая ўсьцяж вядзе сваю акцыю — акружэньня СССР фашыстаўскімі дзяржавамі,—рыхтуючыся да вайны з ім".

Партугальская рэвалюцыя ня спыняецца.

Урадавыя весткі аб канцы партугальскай рэвалюцыі аказаліся перадчаснымі: замест разьбіцьця паўстанчых войскаў, выбухла паўстаньне ў самай сталіцы—Лісабоне. Маракі, паліцыя, рэспубліканская гвардыя і частка войска—далучыліся да паўстанцаў. 2 міністры арыштаваны. У крэпасьць пасаджаны каля 150 палітычных дзеячоў. Ёсьць забітыя і раненыя. Крэйсэр (урадавы?) бамбардуе сталіцу. Адказывае яму цяжкая артылерыя з места. Ідуць баі і пад м. Опорто. Шмат домоў зруйнавана артылерыяй.

Сацыяльнага зьместу рэвалюцыя, здаецца, нямае. Пэўна ізноў, як заўсёды ў Партугаліі, — правакацыя англійскіх „дабрадзеяў", спэкулюючых на спадак партугальскай валюты, каб задарма скупаць сыр'ё ды віно ў краі.

Беларускія дамаганьні у школьнай справе.

Як мы ўжо падавалі, у нядзелю, 6-га лютага, камісія да спраў беларускіх школаў пры віленскім і наваградзкім куратарыумах запрасіла рад выдатнейшых беларускіх дзеячоў на грунце культурна-асьветным, каб даведацца пагляды іх на некаторыя пытаньні, зьвязаныя з праектаваным (каторы ўжо год!) адкрыцьцем беларускіх і „двуязычных" урадавых школ, дзе таго трэбуе беларускае насяленьне. У сераду, 9-га лютага, адбыўся далейшы працяг паседжаньня. На гэтым паседжаньні былі — апрача раней прысутных беларусаў—так-жа кс. Станкевіч, А. Більдзюкевіч і д-р Туронак.

Грамадзяне: Трэпка, Луцкевіч, д-р Я. Станкевіч і д-р І. Дварчанін супольна ўлажылі і падалі на пісьме свае пагляды на пастаўленыя камісіяй пытаньні. Падаем іх зьмест поўнасьцю:

I. У справе ўжываньня гражданкі і лацінікі.

„Мы стаім на становішчы неабходнасьці ўжываньня ў школах ад пачатку навукі беларускае мовы літараў так-званае „гражданкі", грунтуючыся — паміма ўсіх гістарычных успамінаў—на гэткіх падставах:

а) Вялізарная большасьць насяленьня, з увагі на рэлігію, а так-жа з увагі на панаваньне ў газэтах, кніжках і наагул у беларускім друку „гражданкі", ведае яе, дык і паважная лічба дзяцей прыходзе ў школу ўжо ў некаторай меры пазнаёміўшыся з ёю. Дзеля таго ўвядзеньне ад пачатку вучэньня лацінкі выклікала-бы труднасьці пры знаёмленьні дзяцей адначасна з дзьвюма азбукамі,—тым балей, што ўжо ў 3-ім аддзеле дзеці былі-бы прымушаны знаёміцца ўжо з трэцім з чароду альфабэтам — польскім, які розьніцца ад беларускае лацінкі (беларускія літары C, Š, Ž, Ŭ, V).

в) Лацінка фактычна займае дагэтуль у беларускім пісьменстве месца „рытуальнае" азбукі, ды гэтак углядаецца на яе менш асьвечаная частка беларускага народу.

с) Усе друкі, апрача вельмі нячысьленых (каталіцкія кніжкі і часопісі рэлігійнага зьместу), выходзяць дагэтуль толькі гражданкай, дык пазбаўленьне дзяцей веданьня агульна-ўжыванага пісьма адсоўвае іх ад культурных здабычаў.

Пераход у навучаньні на лацініку можа быць зроблены толькі тады, калі ўвесь беларускі народ праз свае компэтэнтныя культурныя і кіраўнічыя ўстановы прынцыпова пастановіць перайсьці на лацінскую азбуку.

Знаёмленьне дзяцей у народнай школе з лацінскім пісьмом, тасаваным да беларускае мовы, павінна распачынацца пасьля добрага знаёмства вучняў з падставамі польскага правапісу (ў 5 аддзеле).

Аб зьмене знакаў азбукі, як і самае азбукі, могуць пастанаўляць толькі навуковыя ўстановы данага народу,—дзеля таго школы павінны ўжываць такіх знакоў пісьма, якія ўжываюцца дагэтуль ці будуць уведзены ў беларускім пісьменстве.

II. Польская мова ў беларускай школе.

З прычыны таго, што навука польскае мовы ў беларускай школе зьяўляецца самамэтай, а ня спосабам перадачы культуры душам дзіцячым, — дык дзеля дакладнага знаёмства з гэтай мовай вызначаецца—пачынаючы ад 3-га аддзелу—гэтулькі гадзін тыднёва, сколькі ў тым-жа аддзеле вызначана для беларускай мовы. У першым годзе навучаньня польскае мовы ўжываецца сыстэма гутарак.

III. Праграма беларускае школы.

За падставу праграмы прымаецца праграма польскае дзяржаўнае народнае школы з 7 аддзеламі—з матчынай беларускай выкладовай мовай. Дзеля гэтага праграма вучэньня зпажылася бы гэтак:

а) **Беларуская мова**: мэта вучэньня — такая-ж самая, як мэта вучэньня польскае мовы ў польскай школе.

в) **Польская мова**: мэта вучэньня—пазнаёміць вучняў з польскай мовай у такой меры, каб вучань, скончыўшы школу, мог карыстацца ёю ў гутарцы і на пісьме, ў што-дзенным ужытку, у пазнаваньні галоўных формаў польскае мовы і важнейшых твораў польскае літэратуры.

с) **Геграфія**: у 3-ім аддзеле — фізычная геаграфія, у 4-ым — геаграфія роднага краю з пашырэньнем на геаграфію Польскага гаспадарства, у 5-ым — чатыры часьці сьвету і пачатак Эўропы, у 6-ым аддзеле (1-ае паўгоду) — канец Эўропы, у 6-ым адезеле (2-ое паўгоду) і ў 7 ым аддзеле—геаграфія Польшчы з навукай аб Польшчы.

Ад пачатку 2-га паўгодзьдзя 6-га аддзелу навука адбываецца ў польскай мове.

д) **Гісторыя**: у 3-ім аддзеле — гутаркі з гісторыі Беларусі, у 4 ым аддзеле—гісторыя Беларусі. Ад 5-га аддзелу навука гісторыі дзеліцца на: гісторыю Польшчы — у польскай мове і гісторыю сусьветнае культуры — у беларускай мове

IV. Двуязычныя школы.

На пытаньне аб датарнаваньні праграмы да двуязычных школ даць адказу ня маем магчымасьці — дзеля таго, што ня можам прадставіць сабе магчымасьці выпаўніць заданьні народнае школы ў гэтай форме.

Характэрна, што на паседжаньні камісіі ў сераду, 9-га лютага, адзіны дагэтуль беларускі фронт у справе шрыфту (гражданкі) разьбіў прысутны ў той дзень кс. Станкевіч, які высказаўся за лацінку.

Пагляды, высказаныя запрошанымі камісіяй асобамі, маюць пайсьці далей да міністэрства асьветы. Ці што з іх будзе прынята пад увагу—даволі сумліўна...

ХРОНІКА.

Паслы на Лукішках. У гэтым тыдні трыманыя на Лукішках беларускія паслы Рак-Міхайлоўскі і Тарашкевіч атрымалі дазвол пабачыцца з сваімі жонкамі. Грам. Рак-Міхайлоўскай дазволена было бачыцца з мужам паўгадзіны, Тарашкевічавай — толькі 5 мінут.

Выступленьне беларускіх студэнтаў. Абураная паходам урадавае прэсы проці грам. Сьвяневіча, асыстэнта Віл. Унівэрсытэту і сябры рэдакцыі „Кур. Віл., які пісаў праз пасла Воевудзкага ў II аддз. ген. штабу даклады з дамаганьнем уступак беларусам,—студэнты беларусы, згуртаваныя каля часопісі „Студэнцкая Думка", напісалі пісьмо ў рэд. „Кур. Віл.", у якім пратэстуюць проці агіднае зьвягі на чалавека, ніколі не пашкодзіўшага беларусам.

Характарна, што сярод надпісаўшых пісьмо гэнае знаходзім імёны прадстаўнікоў усіх кірункаў палітычнае мысьлі—грамадаўскага, сельсаюзьніцкага і хадэцкага. Як відаць, хадэцыя і сельсаюзьніцкая моладзь больш чуткая на ўсякі маральны бруд у палітычнай барацьбе, чым яе павадыры — кс. Станкевіч і Ярэміч, далучыўшыяся да ўрадавага паходу проці пасла Воевудзкага, а тым самым і проці супрацоўніка апошняга—грам. Сьвяневіча.

Карэспандэнцыя ў Грамаду. Як апавядаюць, на пошце ў Вільні ляжаць цэлыя горы пісем, насыланых у Цэнтр. Сэкрэтарыят Грамады і затрымліваных па загаду пракуратуры. Таксама і дастаўляюцца ў Ц. С. і сланыя туды грошы—сяброўскія складкі.

Газэту канфіскуюць на поштах. З розных месц нам пішуць аб канфіскаваньні мясцовай адміністрацыяй і тых нячысьленых нумароў нашае газэты, якія бачаць сьвет.—Гэтак, аднаму з нашых сталых падпішчыкаў у Шчорсах прыйшоў № 3 „Нашага Голасу", ды яго забраў камандант мясцовае паліцыі і адмовіўся выдаць адрасату.

Гэтая асаблівая цэнзура газэт паліцыяй на мясцох—яўнае беззаконьне. Рэдакцыя проці яго—бясеільная!

Правакатары і афэрысты ня сьпяць. Надовячы да дырэктара Белар. Каап. Банку зьявіўся нейкі правакатар, які заявіў, што ён—„прадстаўнік радыкальнай вайсковай арганізацыі", прызнанай „антыпаньствовай", і прасіў павычыць яму з Банку 200 злот. на падарожу ў Варшаву „ў справах палітычных". — Ведама-ж, яго выгналі за дзьверы.

Сьледам за гэтым да жонкі арыштаванага сьв. Коўша, б. кіраўніка Банку, прыйшоў нейкі высокі блёндын, з рабым тварам, з малінавай істужкай і арлом на грудзёх ды з туганабітым партфэлем, які заявіў, быццам ён—„міравы судзьдзя". Ен сказаў, што нібы-то сяньня мае быць звольнены з Лукішак яе муж, дык трэба наперад даць грошы на звошчыка, а ён, „судзьдзя", сам прывязе сьв. Коўша. Тады трэба будзе заплаціць і „рэшту". Узрадавалася кабета, дала, што той прасіў, але праждала ўвесь вечар—дарэмна: афэрыст зьнік!

Лекцыя грам. Грышкевіча. Напамінаем, што ў гэту суботу ў памяшч. Цэнтральнага Гуртка Т-ва Бел. Школы ў Вільні (вул. Сьв. Анны 2) у 7 гадз. увечары адбудзецца чарговая папулярная лекцыя грам. В. Грышкевіча на тэму „Праблема свабоды волі". Тэма гэтая сваей цікаўнасьцяй павінна прывабіць многа слухачоў.

Трэба адзначыць, што лекцыі, ладжаныя ў гуртку, з кожным разам зьбіраюць усё

— „Давай" — крычыць „выкуп за зямлю, ды на жыцьцё цара-арла і яго слуг"!

Глядзіць варона і вачом сваім ня верыць: ад дзеннай працы застаўся ёй з дзяцьмі на жыцьцё толькі адзін якісь нямудры чарвяк, а часамі і таго палавіна.

Стараюцца вароны лепш шукаць жукоў і чарвей, усенькі дзень бегаюць па сваіх пяскох ды балотах, пот з іх ліецца руччом, ногі пакалечылі, пер'е абтрапанае і ў гразі ўсё, а жукоў ня большаець, а з кожным днём меншаець. А тут, як на гора, дзеці пачалі прыбываць (варона, як ведама, птушка пладлівая); што год то ўсё больш і больш варон на адным надзеле жукоў і чарвякоў шукаюць. Няма жыцьця, ды і толькі.

Усьміхаюцца, гледзячы на ворoньню працу, арлы, каршуны, ды падлізы (ўсе яны цяпер былі тлусьценькія, усе жылі назьбіранымі варонамі чарвякамі і жукамі, ды назношанымі курчанятамі).

— „Дурні вы", кажа раптам якісьці каршун. „Чымся вам усім так мучыцца на вашых пяскох, дзе жукоў і чарвей блізка зусім ужо няма, — хадзеце лепш да нас на работу. На нашых палёх жукоў і чарвей сколькі хочаш—будзеце жыць прыпяваючы".

— „А ў нашых вёсках і курчат сяляне маюць і касьцей на шуметнік выкідываюць ня мала"—гаворыць арол.

Паслухалі іх вароны і пайшлі да іх на службу. А каршунам, арлам ды падлізам гэтага толькі і трэба.

Працуюць вароны ад цямна да цямна, зносяць чарвякоў ды жукоў у кадку вялікую, самі-ж жывуць толькі тым, што ім выдадуць гаспадары. А гаспадары даюць надта мала—от, адно толькі каб з голаду вароны ня здыхалі, а рэшту сабе забіраюць. Спрабавалі вароны цішком жыраваць, — от так знойдзе аднаго якога жучка, ці чарвячка глынуць паціху, але арлы і каршуны адразу гвалт паднялі:

— „Зладзейства"!—крычаць—„грэх... За гэта вас, варон, ня толькі тут за жыцьцё на зямлі караць і мучыць трэба, але і па сьмерці чэрці ў пекле смажыць будуць".

Адным словам, няма ратунку варонам, ды і толькі: на сваім пясчаным ласкутку відочная галодная сьмерць, а на працы ў арлоў, каршуноў, ці іх падліз таксама ня мінеш яе.

Але паміраць ніхто не ахвотнік. Вось і пачалі лепшыя вароны ўсяго арлінага царства думаць, як ім скінуць з свайго карку арлоў, каршуноў ды падліз.

І пераканаліся яны, што скінуць з свайго карку зьдзек вароны патрапяць толькі тады, калі, ня гледзячы на тое, дзе каторая з іх працуе і што робіць, аб'яднаюцца ў адну кучу і разам будуць змагацца з сваімі ворагамі; вось надумаўшыся, пачалі паціху гаварыць аб гэтым усім іншым працавітым варонам.

Паслухалі іх вароны, згаварыліся між сабой, ды, выждаўшы добрую хвіліну, калі арлы і каршуны паляцелі ды біліся з куніцамі, самі пачалі біць арлоў і каршуноў, ды так добра, што чуць ня ўсіх і перабілі, а гнёзды іх і ўсе надзелы між сабою падзялілі.

Праўда, пасьля вайны з арламі і каршунамі ў табарышчы быў вялікі беспарадак і голад. Ведаючы аднак, што іхнюю працу ніхто цяпер не забярэ, што яны самі сабе гаспадары, дружна ўзяліся вароны за працу, адбудавалі нанова гнёзды, ачысьцілі ад сьмецьця і гною гушчар, папраганялі розных гультаёў і дармаедаў, і шчасьлівае жыцьцё ізноў наладзілася ў вароньнім табарышчы.

(К а н е ц).

больш ахвочых слухачоў, даючы ім магчымасьць прыемна і з карысьцяй праваздзіць суботнія вечары.

Паседжаньне Цэнтральнага Гуртка Т-ва Беларуск. Школы ў Вільні адбылося ў дзень 3-га лютага с. г. у Народным Доме пры вул. Сьв.-Ганны № 2. Абгаваралася шмат важных пытаньняў у справе культурнай працы ў Народным Доме. Пастаноўлена як найхутчэй прыступіць да арганізаваньня добрай тэатральнай трупы і хору. Часта чытаць лекцыі, ставіць спэктаклі і канцэрты. Папоўніць бібліатэку новымі кніжкамі. Выпісаць для чытальні беларускія і некаторыя ўкраінскія, польскія і расейскія газэты і часопісі, а з заграцічных нямецкія, францускія і чэскія.

Правясьці ў Народны Дом радыё.

Бібліатэка пры Народным Доме будзе адчынена штодзенна ад 5 да 9 гадз. вечара.

Агульны сход Новасьвецкага Гуртка Т-ва Белар. Школы. 16-га лютага 1927 г. у 6 г. увеч. адбудзецца агульны сход сяброў Новасьвецкага Гуртка Т-ва Белар. Школы. Праўленьне Гуртка паведамляе ўсіх сяброў, калі ня зьбяруцца к 6 гадзіне, то сход будзе лічыцца правамоцным калі і ня будзе кворума.

Яўка ўсіх сяброў абавязкава.

У Інстытуце Бел. Культ. і Гасп. У мінулую нядзелю адбыўся зьезд дэлегатаў Віленскага Аддзелу гэтага Т-ва, сымпатычнага па сваей ідэі, але, на жаль, апанаванага зусім неадпаведнымі павадырамі-палітыкамі — кшталтам кс. Станкевічэ, Ярэміча і інш., перарабіўшымі „Інстытут" у сваю палітычную крамку.

На зьезьдзе выбрана новая ўправа Аддзелу, у якую ўвайшоў—побач з старымі павадырамі—грам. Л. Дубейкоўскі.

Асоба грам. Дубейкоўскага дужа добра ведама ў беларускім руху, дый ня з вельмі добрага боку... Уваход яго ў склад управы ўстановы сьведчыць аб нейкім „новым курсе" павадыроў яе: грам. Дубейкоўскі—прадстаўнік самага яркага „полёнофільскага" кірунку і найбліжэйшы супрацоўнік ня менш за яго самога ведамага палк. Ладнова.

Зьезд гмінных радаў у Вільні. 28/II—1/III мае адбыцца ў Вільні зьезд прадстаўнікоў гмінных радаў віленск. ваяводзтва.

Не падзяліліся. Пасьля ліквідацыі ведамае шулерні, якая нягодна карысталася назовам „Беларускага Грамадзянскага Сабраньня", — нейкі час „полёнофілы" жылі толькі з крошак, кіданых ім з дыспозыцыйных (сэкрэтных) сум п. ваяводы Рачкевіча. Але прыйшлі розныя „ашчаднасьці", і вось цёплая кумпанія „полёнофілаў" з „доктарам" Павлюкевічам на чале апынулася ў дужа цяжкім палажэньні, пакуль нехта „геніяльны" не дадумаўся дабіцца ад міласьцівае ўлады дазволу на новы від шулерні: гэта — так-званы клюб „Беларуская Хатка". У клюбе гэтым і пайшла бойкая ігра ў лато, даючы ня кепскі „жыр" полёнофілам...

„Хатка" гэная ўжо ведама з крымінальнае хронікі места Вільні: там надовячы выкрылі нейкія фальшаваныя карты... Але, відаць, нешта ня ладзіцца і сярод саміх „полёнафілаў": у № 32 „Дзен. Віл." з 10 лютага надрукавана пісьмо двух сяброў „Хаткі"—Знамяроўскага і Кабычкіна, якія... „пратэстуюць процi газардовае ігры" ў гэнай „культурна-асьветнай" установе і абвяшчаюць аб сваім выхадзе стуль.

Відаць, як дайшло дзела да падзелу даходаў ад газарду, „культурныя" дзеячы неяк не падзяліліся...

Гожа адзначыць, што ў ноч, калі адбываліся арышты грамадаўскіх паслоў і цэлага раду беларускіх дзеячоў,—у „Хатцы" йшло... „урачыстае п'янства" з учасьцем прадстаўнікоў польскае прэсы. Ведама-ж: „свае людзі", дык цешыліся супольна!

Афіцыяльны курс грошы на 11 лютага. Даляр — 8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 58 гр.

11./II. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,96. Зал. р. 4,70 Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Адкрытае пісьмо.

Урад Беларускага Студэнцкага Саюзу ў Вільні гэтым просіць Аб'яднаньне Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў у Празе ня лічыць наш Саюз уваходзячым ў лік сяброў А. Б. С. А., дзеля параграфу статуту нашага саюзу (аб закрэсе апалітычнай працы саюза).

Урад Б. С. С. ў Вільні.

4—I—1927 г.

Да падпішчыкаў.

Просім усіх тых паважаных падпішчыкаў, каторыя маюць які-колечы інтарэс у адміністрацыі нашае газэты, прытрымлівацца гэтых правілаў.

1) Падпісную плату перасылаць беспасрэдна ў адміністрацыю з паказаньнем падробнага адрасу падпішчыка, а калі разам прысылаецца ад некалькіх падпішчыкаў дык адрас кожнага падпішчыка і колькі ад каго грошы.

2) Пры ўсялякай перапісцы падаваць свой дакладны адрас, абавязкава з паказаньнем тае пошты, з каторае атрымліваецe газэту.

3) Пры перамене адрасу падаваць дакладна абодва адрасы — стары і новы, або: каму спыняецца і хто будзе атрымліваць надалей.

З жыцьця Горадні.

× **З мухі — слон!** Падчас вялікіх вобыскаў і арыштаў у Заходняй Беларусі, якія распачаліся ўноч з 14 на 15 студзеня с.г.,—ды не абмінулі і нашага места, — таксамаператрасьлі шмат хатаў, пачынаючы перш наперш з беларускіх палітычных і культурных установаў: Павятовага Камітэту Б.С.—Р. Грамады і Акружнае Управы Т-ва Беларускае Школы. Пры гэтым заарыштавалі старшыню Павятовага Камітэту Вінцука Шушкевіча, сэкрэтара Уладзіміра Паддубіка, дый старшыню Горадзенскага Гуртка Мікалая Якімовіча і сэкрэтара Надзею Самчучанку.

Горадзенская прэса ад хадэкаў да „маральнага адраджэньня" зрабіла трывогу, пускаючы стацьцю за стацёй у сваіх газэтах. У аднэй пішуць: „Likwidacja wielkiej wywrotowej organizacji na terenie Grodna", у другой „Niedoszli spiskowcy", у трэцей, — што ў В. Шушкевіча, М. Якімовіча і ў Павятовым Камітэце знайшлі склад аружжа, амуніцыі дый камуністычнае бібулы. У сувязі з гэтым, як прадстаўнік беларускае прэсы, лічу сваім абавязкам высьветліць, што ніякай бібулы, аружжа, амуніцыі ніўкога ў беларусаў пры вобысках у Горадні ня знойдзена.

Усё — гэта ілжывыя вестки, высcаныя з пальцаў брукoвых карэспандэнтаў. Беларускае грамадзянства бачыць у гэтых арыштах уплянаваны паход процi культурных, палітычных і эканамічных дзеячоў дый наагул процi самастойнага разьвіцьця беларуск. народу.

Молат.

Карэспандэнцы.

Праз каханьне дармаеда беларускім дзеткам бяда.

(Скідэльская гміна).

У суседняй вёсцы Асашнікі вучыць дзетак вуму-розуму папольску нейкая паненка з Кракава. Трэба-ж было гэтай кветцы закахацца ў свайго калегу, вуч. з вёскі Белясоўшчына, а той, павгдзіўшы кракаўскую зязюлю за дзюб, узяў дый кінуў. Вось праз гэта і нэрвуецца цяпер гэтая птушка, — ды злуецца. Мала таго, што карысьці з яе навукі, як з казла малака, — усю злосьць і помсту яна вылівае на бязвінных дзетках. Гэтак, паміма таго, што бяз дай прычыны цягае іх за вушы, рве за валасы, становіць на калені і т. д.,—яна выкідае такія „спрытныя" нумары. Прыгожа: адчыніць дзьверы і марозіць дзетак. Бацькі падалі заяву Школьнаму Інспэктару, каб зьмяніць гэтае дабро.— А другая — ці-ж лепшая будзе?...

Гэта нам, браткі беларусы, на кожным кроку падказвае, каб як мага станаўчэй дамагацца свае роднае школкі, дзе будуць людзі сумленныя, шчыра адданыя сваей працы, а гэтыя кракоўскія асьветнікі хай тагды сабе кахаюцца на здароўе, — у сябе дома.

М. В. Сусед.

Нам пішуць з вескі што:

× Клейна Адольф з вёскі Новай Хадараўкі, Сухавольскай гм., Сакольскага пав., быўшы вучыцель польскай школы і звольнены з пасады ўлетку 1926 году — цяпер працуе як сышчык, ці шпік у дэфэнзыве, езьдзячы па вёсках і нюхаючы дзе хто і як гавора процiў уціску адміністрацыі і паліцыі.

Перасьцерагаем насяленьне Сакольскага пав., перад гэтым шпіком.

× Камандант пастарунку ў в. Гарадзея, Нясьвіскага пав., разам з войтам гміны застрашылі сяброў Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Новая-Вёска і забралі ад іх сяброўскія білеты, а вучыцель Ежыковскі адабраў ад дзетак беларускія кніжкі і змушае праваслаўных дзетак ужо навет малітвы чытаць каталіцкія і папольску.

× У часе масавых вобыскаў і арыштаў уночы з 14 на 15 студзеня, у кватэры старшыні гуртка Т-ва Белар. Школы ў вёсцы Міхалева, Беластоцкага пав., грам. В. Сакалова зроблены вобыск, пры якім забраны ўсе паперы гуртка Т-ва Белар. Школы, а таксама не разданыя сяброўскія білеты Т-ва. Усякія сходы ў справе Т-ва Белар. Школы паліцыя забараніла.

× Як толькі жыхары в. Бадзень, Мядзельскай гм., Пастаўскага пав., склалі дэкларацыі на беларускую ўрадовую школу, пачаўся паход панскіх выкідышаў з Галіцыі, польскіх вучыцялёў на няшчасную беларускую вёску, з шалёнай агітацыяй процi ўсяго беларускага.

Ня менш адзначыўся ў гэтай „патрыятычнай" справе вучыцель Язэп Бярняк, які паходзіць з в. Кузьмічы, Жасьнянскай гм., Пастаўскага пав. Ён страшыў бацькоў тым, што ад іх будуць спаганяць грошы за мэтрыкі і за довады, а паўнамоцніку П. Галамызды паабяцаў Лукішкі. Усё гэта рабілася тады, як у народзе панавала паніка ад масавых арыштаў і нікога з сьвядомых вясковых хлопцаў ня было дома. Таму пужлівыя бабы і мужчыны пад націскам масавых арыштаў прымушаны былі падпісаць падсунуты ім якісь пратакол.

Чэсьць і слава змагарам за родную школу. Ганьба рэнэгатам Берняком. Іх шкадлівая дзеяльнасьць будзе помніцца ў Беларускім народзе.

Ад Рэдакцыі. Імя Язэпа Берняка вядома некаторым сябрам рэдакцыі. гэта яго сваячкі вучыліся ў свой час у Будслаўскай Беларускай Гімназіі. На дрэнную дарогу зьвярнулі Вы, пане Бярняк.

× Грамадзяне вёскі Кудрычы, Крынскае гм., Горадзенскага пав., калі зьявіўся войт Кундзіч на выбары солтыса, аднагалосна выбралі грамадзяніста Савіцкага Якуба. У часе выбараў Кудзіч прасіў, каб не выбіралі на солтыса „маладога", а каб выбіралі чалавека „старэйшага". Ну, вядома, ён хацеў-бы, каб выбралі такога, які ня ўмее ні чытаць ні пісаць, ды якога ашукаць зручней. Па выбарах войт заявіў: „powiadam wam panowie, że Starosta niezatwierdzi".

Ходзяць чуткі, што войт Кудзіч вельмі хоча, каб солтысам застаўся Ю. Ганчарук, які быў выбраны на солтыса ў прошлым годзе ды надта спадабаўся войту за сваю шчырасьць, але народ ня хоча юды-здрайцы — і ганьбіць гэтага панскага падлізьніка.

Рух і праца культурная не замерла.

(В. Руткавічы-Зарэчча ў Наваградчыне).

У вёсках Руткавічы-Зарэчча і Руткавічы-Новыя Карэліцкай гміны, 5 гадоў істнавала польская школа і на долю нашу выпадалі што год то новыя вучыцялі ці вучыцелькі (адны другіх лепшыя), а дзеці, як былі няпісьменныя, дык і асталіся такімі. Каторый крыху і перэслібізуе, распішацца, але і то ня кажды

Бачучы гэта, сяляне пастанавілі здчыніць, хоць на свой кошт, беларускую школу. І што-ж? добра, найшлі вучыцеля, каторы скончыў Радашкоўскія беларускія вучыц. курсы, нашлі дом пад школу, усё зрабілі па закону згодна з інструкцыямі школьнымі, і падалі заяву да школьнага Інспэктара. Адказу да гэтага часу няма. Чакаюць бацькі, чакаюць і дзеці ў школу не пашлі. Два месяцы сядзелі, вучыцель у Зарэччы, а вучыцелька ў Новых-Рутк., чакаючы дзень ада дня чакаючы, што прыдуць дзеці ў школу, ажно дарэмныя іх надзеі: усе дзеці сказалі; „хіба нас на ланцугох папрывязываюць ў польскай школе, і то сарвемся"! У хуткім часе прышлі павесткі плаціць штраф па 6 зл. ад дзіцяці, але бацькі сказалі, што ўсе гурбаю пойдзем сядзець у арэшце, бо грошай адкуль узяць? лепш купіць беларускую кніжку для дзіцяці. Бачачы, што не памагаюць штрафы і пастрахі вучыцеля і, што за другі месяц прыдзецца плаціць па 15 зл., быў выкліканы кіраўнік карэліцкай сямікласоўкі п. Далешбо, войт з гміны Лагута, і сэквэстратар Васілеўскі; адно не хапала паліцыі. І што-ж, склікалі людзей з чатырох вёсак абяцуючы даць усе надручнікі казённыя, вучыць палавіну лекцыяў пабеларуску і г.д., і калі людзі згадзіліся ўжо на палавіну, але з той умовай каб на беларускія лекцыі быў вызначаны вучыцель Галоўнай Управы Т-ва Беларускае Школы, то на гэта не здаліся нашы панкі, гаворачы, што беларускі вучыцель ня мае польскае кваліфікацыі. „Але добра, паночкі" адказваюць людзі, гдзе польскі вучыцель узяў беларскую кваліфікацыю? Няма чаго нам закручываць галавы едзьце адкуль прыехалі, а мы за свае грошы купім беларускія кніжкі для дзяцей, і будзем вучыць самі. Нязваныя госьці паграджалі штрафамі яшчэ большымі, і дакадавалі, што дзеці будуць марнаваць час без навукі, і што кніг у Вільні малы выбар, і хто яго ўспомніць усю тую брахню іх. Слухалі і дзеці, сабраўшыся каля запечку ўсю брахню гэную і не выцярпеўшы рунулі таўпою як хлопчыкі, так і дзяўчаткі да стала, дзе важна сядзеў п. Далемба і др. са славамі: „ня хочам польскай школы, а давайце нам нашую беларускую! Мы шэсьць гадоў таптaлі лапці і асталіся няпісьменнымі, і далей ня будзем датаптываць вобуў, — няхай бацькоў і нас разам саджаюць у турму, а ў польскую школу ня пойдзем"! Раздаліся кругом воплескі, смех радасьці і кожнага загаварыла пачуцьцё, што з гэтых дзяцей будзе нешта добрае—карыснае. Бачачы, што папалі ня туды, куды-б хацелася, вельможныя панкі лахі пад пад дый паехалі ў сваю дарогу. А людзі таксама разышліся па сваіх кутках з цьвёрдаю воляю дамагацца свайго. Спусьціўшы нейкі тыдзень, зьяўляецца заступнік навагр. школьнага Інспэктара. Ізноў сход, гутарка з пустога ў парожняе, але канец — той самы — усе ўадно „давайце беларускую школу паводле закону, а не, бярэце свае сабе цапкі са школ, няхай не замінаюць нам, а вучыцельства няхай не мазоліць вачэй". Так і вышла: штрафаў ня сыскалі, скамейкі і другія рэчы забралі, а вучыцялі гдзесь у другія школы паехалі. „І дзякуй Богу", гаварылі сяляне і дзеці, цяпер то ўжо напэўна ня будзе польскае школы, туды ім і дарога"! Што-ж цяпер рабіць?

Радзіліся бацькі, і сяк і так, што рабіць? як дабіцца тае навукі, каторае не даюць і не маглі дабраць розуму ў сваей галаве, але дзеці самі вывелі іх з гэтае неспакойнасьці. Усе дзеці, як толькі пазналі, што яны ўжо напэўна асталіся бяз школы, самі сталі групкамі сабірацца і радзіцца, што ім зрабіць? І першым крокам іх было: тыя грошы, каторыя яны складалі на тытунь, або ў гулянку ў карты, сталі зьбіраць грошык да грошыка і прасіць старшых — купіць ім беларускіх кніг і п'ес для дзяцей на спэктаклю. Жаданьне — было выпоўнена і гэтае маладое пакаленьне, будучая надзея, зрабіла тое, што ні адзін з нас у гэткім веку ня здолеў зрабіць.

За дзьве нядзелі да каляд заварушыліся дзеці, каб зрабіць ёлку між сьвят і адыграць п'есу „Дзіўны лапаць". Прыгатавалі п'есу, вывучылі шмат вершаў, Янкі Купалы і др. песьняў і расказаў. У дзень Новага году сабраліся ў Зарэччы і дзеці з другіх вёсак, зрабілі рэпэтыцыю сваіх вершаў, а на трэці дзень вызначылі ёлку і тут жа ў чэсьць дня Новага году прысягнулі глядзець адзін за другім, каб ня курылі, каб ня было жадных лаянак, а калі хто з іх зламае прысягу, то пастанавілі, выкінуць з сваей дзяцінай грамады. Спатыкалі Новы год таксама а 12 гадзіне ўначы з гарачымі прамовамі, як маглі, і навучаючы адзін другога добрым прыкладам. Галоўным жаданьнем іх было жаданьне беларускае школы і г.д.

На заканчэньне сьпяялі некалькі беларускіх песьняў, папрасілі старшых, каб ім сыгралі на гармоніцы лявоніху, і з тым, з вялікай радасьцю і бадзёрамі думкамі на лепшае будучае разышліся.

Чэсьць і слава Вам, дарагія дзеткі Руткаўцаў, няхай па вашаму прыкладу пойдуць усе дзеткі нашае многа пакутнай бацькаўшчыны Беларусі!

К. Бясхатняя.

Да роднай вёскі.

Паслухай, брат із-пад Дубровы
(Магілкі там маіх бацькоў!),—
Паслухай вершык роднай мовы,
Паслухай шчырай праўды слоў!

Уцям, браток, цікуй далёка...
Ці бачыш новую зару,
Як разляглась, чуць зглядзіць вока,
І ўдоўж над намі і ўгару!?

А ты у сумнай цемры ночы,
Сплючы ў няшчаснай галіце,
Ніяк прадзерць ня можаш вочы,—
І не дабудзішся цябе!..

Ўвесь люд сусьветнае галоты
Закапашыўся вунь—глядзі!
І да супольнае работы
Заве й цябе; хутчэй ідзі!..

Збавіцеля мо' ты чакаеш,
Каб дапамог на ногі ўстаць?
Няўжо-ж, браток, дасюль ня знаеш,
Што нам іх нечага чакаць?!...

Адсюль да самае Жаневы
„Збавіцеляў" хоць гаці гаць...
Але за нашы жалі, гневы,
Што яны здалелі нам даць?

Або ў той Рызе і Вэрсалі
Цябе там тузалі дарма...
Што твае сьлёзы ім і жалі!
Яны ня скінуць з нас ярма!..

Твае надзеі топчуць марна,
Табе нічога не дадуць
І так ў Жаневе, як ў Лёкарна
Бяздольным людам торг вядуць!

Дык вось, братко із-пад Дубровы!
Ў чаканьні лепшага жыцьця
Бяз роднай школы, роднай мовы
Ты чэзьнеш і тваё дзіця!...

Да лепшай долі, наш народзе,
Супольным шэрагам ідзі,
Магутнай сілай, ў дружнай згодзе
Будзіся сам, другіх будзі!.. —скі.

Паштовая скрынка.

Беларускаму патрыоту. Карэспандэнцыю Вашу зьмяшчаем скарочанай, дзеля недахвату месца. Перапіс у Вас адбыўся, відаць неафіцыяльны, якісь прыватны. — **І. Аўхікіну.** Ваша карэспандэнцыя вострая па зьместу, таму непадходзіць — **С. Шуленьку.** З Вашай карэспандэнцыяй трэба пачакаць.—**М Марчэні.** Усей Вашай карэспандэнцыі выкарыстаць ня можам.—**Наднёманцу.** Выкарыстоўваем частку Вашай карэспандэнцыі, з астальной трэба пачакаць.—**Рудовічу П.** Вершу Вашага не зьмяшчаем, бо надта востры.—**Нявыганскаму.** Усяго зьмясьціць цяпер ня можна.—**Падпішчыку 5230.** Вашы вершы, як Вы ўгадалі, зьмясьціць ня можам Але пішыце і апрацоўвайце добра, каб верш быў гладкі. З Вас можа штось выйсьці.—**В. Кульгаўчыку.** Адну карэспандэнцыю зьмяшчаем, другая не на часе.—**Орэнбіцкаму.** Усяго не зьмяшчаем, бо нічога цікавага ў Вашых лістох няма.—**Якубу Місьцы.** Карэспандэнцыя Ваша добра напісана, зьмяшчаем яе цалком. Пішыце больш. Верш, хоць і нічога сабе, але не зьмяшчаем, бо баімося, каб не пашкодзіў ён газэце. — **Г. Пятровічу.** Карэспандэнцыі Вашай зьмясьціць ня можам, бо няма месца. У справе кніжак зьвярніцеся да Беларускай Кнігарні (Wilno Ostrobramska № 1).—**Максіму Засіму** Вершу Вашага зьмясьціць ня можам, па незалежных ад нас прычынах. Наагул-жа пішыце, можа з Вас што і выйдзе.—**Мэханіку.** Вершы занадта вострыя, таму не зьмяшчаем.

Усячына.

„Працэс 21.000"...

„Працэс 21.000"... Не,—пакуль-што яшчэ — не палітычны!... Гэта — працэс сяброў львоўскага каапэратыву... Каапэратыў, ну, ведама-ж, лопнуў. Грошы растрачаны... Хто вінават? — Вось і пасварыліся — сябры ды Управа: Управа кажа, што вінаваты сябры, якія не даплацілі складак аж на 400.000 зл.; сябры кажуць, што Управа, якая растраціла і тое, што ўнясьлі.. Суд мае разабрацца ў гэтым. Аднак-жа першае паседжаньне суда не ўдалося: саля не магла зьмясьціць усіх абвінавачаных, якіх набралася—6.000... Узьняўся бязлад, у выніку якога суд адлажыў працэс — няведама дакуль!

Здаецца, гэткіх працэсаў сьвет яшчэ ня бачыў. А яшчэ кажуць, што ў Польшчы — „недахват гаспадарча творчага духу"!...

Рэдактар-Выдавец: Альберт Эйсак.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.